Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар універсітэта
____________ Н.У.Карчэўская
30 / 12 2025
Рэгістрацыйны № ВД - 6/25-115/ эвуч.

# ПАСТАНОЎКА ГОЛАСУ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0215-09 Харавая творчасць,
прафілізацыі: харавая музыка народная

2025

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0215-09 Харавая творчасць, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 270, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасці.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Л.В.Снапкова*, дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*І.У.Канцэвіч*, старшы выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А.Я.Цэхавая,* старшыня цыклавой камісіі «Народная музычная мастацкая творчасць (харавая музыка)» установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў»;

*Ф.Л.Коцяш,* дацэнт кафедры харавая музыка ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4, ад 01.12.2025);

*прэзідыўмам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2, ад 20.12.2025).

**УЗГОДНЕНА**

Дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода

______________________Н.В.Кользун

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Пастаноўка голасу» займае важнае месца па падрыхтоўцы кіраўнікоў хору. Гэта адна з галоўных прафілюючых вучэбных дысцыплін, засваенне якой дапамагае падрыхтаваць высокаадукаванага спецыяліста.

Кіраўнік народнага калектыву павінен валодаць народнай манерай спеваў, ведаць методыку навучання пастаноўкі голасу, творча падыходзіць да вырашэння важнай праблемы сучаснасці – захавання, развіцця і прапаганды традыцый народнапесеннага выканальніцтва, садзейнічаць павышэнню прафесійнага ўзроўню выканальніцкага майстэрства фальклорных калектываў і асобных выканаўцаў.

Практычнае знаёмства студэнта з народнай манерай спеваў пачынаецца з выпрацоўкі навыкаў песеннага дыхання, апоры гуку, дыкцыі і атакі гуку, авалодвання правільным гукаўтварэннем на вакальных практыкаваннях і творах. Важным этапам вучэбнай работы ў класе па пастаноўцы голасу з'яўляецца вывучэнне і авалоданне рэгіянальнымі песеннымі традыцыямі і выканальніцкімі манерамі розных рэгіёнаў Беларусі.

Вучэбная дысцыпліна «Пастаноўка голасу» уваходзіць у модуль «Харавы клас», вывучэнне якога павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі: валодаць навыкамі харавога выканальніцтва і культурай харавога мыслення, праводзіць рэпетыцыйную і канцэртна-выканальніцкую дзейнасці ў якасці ўдзельніка і кіраўніка хору, ансамбля.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Пастаноўка голасу» цесна звязана з вывучэннем такіх вучэбных дысцыплін, як «Харавы клас», «Выканальніцкае майстэрства», «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін», «Расшыфроўка, аранжыроўка і апрацоўка народнай песні», «Беларуская народна-песенная творчасць і песенная этнафонія», «Асновы сцэнічнага руху», «Бытавы танец».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды па авалодванні народнай манерай спеваў, выхаваць высокаадукаванага спецыяліста ў галіне народна-песеннага выканальніцтва.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

- авалодаць тэхнікай спеваў, у якой вакальная праца накіравана на прастату, натуральнасць і характарнасць спеваў, вакальную роўнасць гучання голасу;

- выхаваць размоўную манеру спеваў, выразнае асэнсаванае гукаўтварэнне праз інтанацыйна-сэнсавы пасыл, які раскрывае агульны змест твора;

- развіць артыстызм выканаўцы праз разуменне драматургіі народнай песні;

- выхаваць музычна-выканальніцкі і мастацкі густ на лепшых узорах народнай і аматарскай творчасці і на падставе вывучэння вопыту выдатных майстроў народных спеваў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

- механізм гукаўтварэння і гукавядзення ў народнай манеры спеваў;
- тэхніку правільнага песеннага дыхання;
- рэгіянальныя асаблівасці народна-песеннага выканальніцтва.

*умець:*

- свабодна і прафесійна валодаць народнай манерай спеваў;
- карыстацца вакальна-тэхнічнымі навыкамі народнай манеры спеваў;
- выконваць творы а капэла і з суправаджэннем;
- выкарыстоўваць мастацка-выразныя сродкі для перадачы зместу выконваемага вакальнага твора;
- карыстацца прынцыпамі падбору рэпертуару.

*валодаць:*

- методыкай выкладання пастаноўкі голасу;
- методыку работы з вакальнымі творамі.

У межах адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна сваёй краіны, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым і сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Пастаноўка голасу» на дзённай форме навучання ўсяго адведзена 446 гадзін, з якіх 248 гадзіны – аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі ў I–VIII семестрах. Для завочнага навучання 336 гадзін, з якіх 32 гадзін - аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі I–VIII семестрах. Рэкамендаваныя формы бягучай атэстацыі – тэхнічны залік. Рэкамендаваныя формы прамежкавай атэстацыі – залікі, экзамены.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры.

### *Тэма 1. Уводзіны.*

Задачы вучэбнай дысцыпліны. Месца і роля вучэбнай дысцыпліны «Пастаноўка голасу» ў сістэме прафесійнай падрыхтоўцы выканаўцы народнай песні, выкладчыка. Мэта, задачы і структура вучэбнай дысцыпліны, сувязь з іншымі дысцыплінамі курса. Асаблівасці і спецыфіка навучання народнай манеры спевам.

### *Тэма 2. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музыкальных даных, індывідуальных недахопаў.*

Замацаванне песеннай установкі і развіццё правільных навыкаў спеваў: мяккай атакі гуку, плаўнага і роўнага гукавядзення, дакладнай перадачы мелодыі (рытму, вышыні гуку, фразіроўкі, эканомнай артыкуляцыі, натуральнага вымаўлення слоў).

### *Тэма 3. Фарміраванне дакладнай дыкцыі, работа над словам.*

Праца над дыкцыяй пры дапамозе спецыяльных практыкаванняў. Эканомная артыкуляцыя, натуральнае вымаўленне слоў. Аб'яднанне розных галосных. Вымаўленне зычных гукаў. Спалучэнні галосных і зычных гукаў. Трэніровачныя моўныя практыкаванні. Трэніровачныя вакальна-моўныя практыкаванні.

### *Тэма 4. Авалоданне спеўным дыханнем і яго развіццё.*

Песенная ўстаноўка. Віды дыхання. Кіраванне патокам выдыхаемага паветра. Апора дыхання і апора гуку. Авалодваннее спеўным дыханнем і яго развіццё. Авалоданне філіроўкай гуку. Знаёмства с разнастайнымі методыкамі паляпшэння спеўнага дыхання і іх апрабаванне.

### *Тэма 5. Набыццё навыкаў спеваў кантылены.*

Выпрацоўка кантылены – плаўнага, звязнага, безперапыннага, свабоднага гучання. Набыццё навыкаў спеваў у прымарнай зоне. Спевы практыкаванняў на невялікія інтэрвалы. Дасягненне вакальнага тонусу, мабілізацыі галасавога апарату, уключэнне ў работу патрэбных стэрэатыпаў і асацыяцый. Выпрацоўка навыкаў спеваў у межах квінты, сексты, септымы для жаночых галасоў, у межах септымы, актавы для мужчынскіх галасоў. Удасканальванне плаўнага гукавядзення з ужываннем розных практыкаванняў.

### *Тэма 6. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі.*

Выяўленне індывідуальных недахопаў і шляхоў іх пераадолення. Замацаванне песеннай установкі і развіццё спеўных навыкаў, вызваленне

песеннага апарату ад напружанасці, ліквідацыя дэфектаў гукаўтварэння, дакладная перадача мелодыі (рытму, гукавышыннасці, фразіроўкі). Замацаванне высокай пазіцыі для падцягвання інтанацыі.

*Тэма 7. Выпрацоўка рухомасці, гібкасці і палётнасці голасу.*

Удасканальванне вакальнай тэхнікі пры дапамозе практыкаванняў па выраўнованні галосных па ўсім дыяпазоне. Спевы практыкаванняў на рухомасць голасу ў хуткіх тэмпах, са скачкамі ўверх, уніз.

*Тэма 8. Згладжванне рэгістравых пераходаў. Пашырэнне дыяпазону.*

Засваенне тэхналагічных прыёмаў развіцця дыяпазону. Удасканаленне выкальнай тэхнікі пры дапамозе практыкаванняў па выраўноўванні галосных па ўсім дыяпазоне. Выкарыстанне спецыяльных практыкаванняў на рухомасць голасу ў шырокім дыяпазоне, хуткім тэмпе, з вялікімі скачкамі як уніз, так і ўверх. Авалоданне галаўным і грудным рэзаніраваннем, навыкам аб'яднання іх у працэсе спеваў. Вызваленне пеўчага апарату ад напружанасці. Ліквідацыя недахопаў гукаўтварэння.

**Раздзел 2. Засваенне спецыфічных прыёмаў традыцыйнага народнага гукаўтварання.**

*Тэма 1. Знаёмства з асаблівасцямі дыялектаў.*

Засваенне спецыфікі вымаўлення розных гаворак. Перайманне народна-выканальніцкай манерай і прыёмамі. Рэдуцыраваныя галосныя. Засваенне тэхнікі рэдуцыраваных галосных.

*Тэма 2. Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх прыёмаў народнага гукаўтварання.*

Вывучэнне традыцыйнага народнапесеннага выканальніцтва. Засваенне тэхнікі выканання народных мелізмаў. Спевы асноўных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння: расцягванні слоў на дадатковыя галосныя, паўторнасць складоў, арнаментыкі, слізганняў, прыгукаў, народных мелізмаў і мардэнтаў, глісандуючых гукаў, спадаў, абрываў складоў і інш.

*Тэма 3. Удасканаленне вакальна-тэнічных навыкаў і ўменняў.*

Спевы складаных практыкаванняў на дыкцыю, дыханне, развіццё дыяпазону, рухомасць голасу. Пошук свайго выканальніцкага крэда. Удасканаленне вакальнай тэхнікі. Асэнсаванасць інтанавання музычна-паэтычнага тэксту, выразнасці і вобразнасці выканання.

*Тэма 4. Развіццё практычных навыкаў спеваў.*

Работа над чыстай інтанацыяй. Засваенне роўнага і плаўнага гукавядзення на больш шырокім дыяпазоне. Далейшае развіццё навыкаў спеваў у народнай манеры у межах квінты, сексты, сэптымы для жаночых галасоў; у межах сэптымы, актавы для мужчынскіх.

*Тэма 5. Авалоданне навыкамі імправізацыі.*

Знаёмства з метадамі імправізацыйнага выканальніцтва на прыкладзе фальклорнага матэрыялу. Вывучэнне стылявой разнастайнасці беларускага песеннага фальклору. Набыццё навыкаў выканання ўзораў аўтэнтычнага фальклору.

**Раздзел 3. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака.**

*Тэма 1. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці.*

Выкарыстанне твораў у павольных і хуткіх тэмпах Выкарыстанне дынамічных адценняў у інтэрпрэтацыі народнай песні. Работа над майстэрствам выканання разнажанравых беларускіх народных песень. Выкарыстанне тэмбральнай афарбоўкі голасу для перадачы сэнсу песні. Праца над фразіроўкай, вакальна-выканальніцкае ўдасканальванне твора.

*Тэма 2. Работа над стварэннем мастацкага вобраза.*

Выкарыстанне спецыфічных метадаў і кірункаў у інтэрпэтацыі народнай песні. Творчы падыход да стварэння сюжэтнай лініі. Праца над драматургіяй народнай песні. Асэнсаваны падыход да інтанавання музычна-паэтычнага тэксту. Удасканальванне выразнасці і вобразнасці выканання.

*Тэма 3. Падбор і фарміраванне рэпертуару.*

Выкарыстанне разнажанравага рэпертуару. Дыферэнцыраваны падыход да выбару народных песень. Фарміраванне творчай асобы студента-спевака. Актыўная канцэртная дзейнасць. Арганізацыя самастойнай работы па падборы рэпертуару. Развіццё прафесіяналізму ў народнапесенным выканальніцтве.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў дзённай формы навучання

| Назва раздзелу, тэмы | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | | Індывідуальныя заняткі | | |
| 1 | **Раздзел 1. Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры** | | | |
| 2 | Тэма 1. Уводзіны | 2 | | |
| 3 | Тэма 2. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музыкальных даных, індывідуальных недахопаў | 4 | | |
| 4 | Тэма 3. Фарміраванне дакладнай дыкцыі, работа над словам | 16 | 6 | калёквіўм |
| 5 | Тэма 4. Авалоданне спеўным дыханнем і яго развіццё | 18 | 6 | вуснае апытанне |
| 6 | Тэма 5. Набыццё навыкаў спеваў кантылены | 14 | | |
| 7 | Тэма 6. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі | 16 | 6 | творчая заданне |
| 8 | Тэма 7. Выпрацоўка рухомасці, гібкасці і палётнасці голасу | 8 | | |
| 9 | Тэма 8. Згладжванне рэгістравых пераходаў. Пашырэнне дыяпазону | 12 | | |
| 10 | **Раздзел 2. Засваенне спецыфічных прыёмаў традыцыйнага народнага гукаўтварання** | | | |
| 11 | Тэма 1. Знаёмства з асаблівасцямі дыялектаў | 8 | 2 | творчая работа |
| 12 | Тэма 2. Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх прыёмаў народнага гукаўтварання | 10 | 4 | творчае заданне |
| 13 | Тэма 3. Удасканаленне вакальна-тэнічных навыкаў і ўменняў | 18 | 4 | вуснае апытанне |
| 14 | Тэма 4. Развіццё практычных навыкаў спеваў | 18 | 4 | творчае заданне |
| 15 | Тэма 5. Авалоданне навыкамі імправізацыі | 8 | | |
| 16 | **Раздзел 3. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака** | | | |
| 17 | Тэма 1. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці | 16 | 6 | творчая работа |
| 18 | Тэма 2. Работа над стварэннем мастацкага вобраза | 16 | 8 | творчая работа |
| 19 | Тэма 3. Падбор і фарміраванне рэпертуару | 18 | | |
| **Усяго: 248** | | **202** | **46** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў завочнай формы навучання

| Назва раздзелу, тэмы | Назвы раздзелу, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін |
|---|---|---|
| | | Індывідуальныя заняткі |
| 1 | **Раздзел 1. Развіццё практычных навыкаў спеваў у народнай манеры** | |
| 2 | Тэма 1. Уводзіны | 1 |
| 3 | Тэма 2. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музыкальных даных, індывідуальных недахопаў | 1 |
| 4 | Тэма 3. Фарміраванне дакладнай дыкцыі, работа над словам | 2 |
| 5 | Тэма 4. Авалоданне спеўным дыханнем і яго развіццё | 2 |
| 6 | Тэма 5. Набыццё навыкаў спеваў кантылены | 2 |
| 7 | Тэма 6. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі | 2 |
| 8 | Тэма 7. Выпрацоўка рухомасці, гібкасці і палётнасці голасу | 2 |
| 9 | Тэма 8. Згладжванне рэгістравых пераходаў. Пашырэнне дыяпазону | 2 |
| 10 | **Раздзел 2. Засваенне спецыфічных прыёмаў традыцыйнага народнага гукаўтварання** | |
| 11 | Тэма 1. Знаёмства з асаблівасцямі дыялектаў | 2 |
| 12 | Тэма 2. Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх прыёмаў народнага гукаўтварання | 2 |
| 13 | Тэма 3. Удасканаленне вакальна-тэнічных навыкаў і ўменняў | 3 |
| 14 | Тэма 4. Развіццё практычных навыкаў спеваў | 2 |
| 15 | Тэма 5. Авалоданне навыкамі імправізацыі | 2 |
| 16 | **Раздзел 3. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака** | |
| 17 | Тэма 1. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці | 2 |
| 18 | Тэма 2. Работа над стварэннем мастацкага вобраза | 3 |
| 19 | Тэма 3. Падбор і фарміраванне рэпертуару | 2 |
| **Усяго:** | | **32** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. Грамовіч, І,М. Методыка работы з фальклорным гуртом : курс лекцый / [сярод.рэц.: Я.М.Рэутовіч]. Мінск : [б.в.], 2009. – 137, [1] с. : нот
2. Емельянов, В.В. Развитие голоса. Координация и тренинг. – Изд. 4-е., стер. – Санкт-Петербург : Лань, 2004. – 191 с. : ил. – Библиогр.: с. 158-159 (18 назв.).
3. Леановіч, З.Л. Работа з вакальным ансамблем [Ноты] : вучэбна-метадычны дапаможнік / [сярод рэц.: І. М. Грамовіч]. – Мінск : [б. в.], 2007. – 120, [2] с. : малюнкі, нот.
4. Романовская, И. И. Сольное пение. Постановка голоса : учебно-методическое пособие для специальности пение (по направлениям), направления специальности Пение (народное), специальности Народное творчество (по направлениям), направления специальности Народное творчество (хоровая музыка), специализации Хоровая музыка народная. – Минск : БГУКИ, 2023. – 102 с. ; 29x21 см.
5. Холупава, Л. І. Пастаноўка голасу [Ноты] : вучэбна-метадычны дапаможнік / [сярод рэц. Я. М. Рэутовіч]. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 252, [1] с. ; 29x20 см.
6. Холупава, Л. І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль [Ноты] : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вну па спецыяльнасці "народная творчасць (харавая музыка)" / [сярод рэц. Я. М. Рэутовіч]. – Мінск : [б. в.], 2008. – 187, [1] с. ; 29x20 см. – Бібліягр.: с. 184-185 (20 назв.).


*Дадатковая*


1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн: Універсітэтскае, 1989. – с.128-320.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн: Універсітэтскае, 1995. – с. 100-250.
3. Варфаламеева, Т.Б. Песні Беларускага Панямоння [Ноты] / [навук.рэд. З.Я.Мажэйка]. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 284, [2] с.
4. Вянок беларускіх народных песень / запіс у Раговіча. – Мн: Навука і тэхніка, 1988. – 432 с..
5. Дарога ля жыта: песні бел. кампазітараў на вершы В.А. Жуковіча / укл. В.А. Жуковіч. – Мн.: Беларусь, 2001. – 144 с.
6. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Москва : Музыка, 2007. – 368 с. : нот., ил. – Библиогр.: с.361 – 365 (130 назв.).
7. Купальскі спеўнік : метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А. Пладунова. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с.
8. Мажэйка, З Я Песні Беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мн: Навука і тэхніка, 1981. – с. 80–120; с. 300–480.

9. Мажэйка, З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн: Бел. навука,1999. – 276 с.
10.Можейко, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М.: Сов.композитор, 1983. – Вып 1. – 184 с.
11.Можейко, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М.: Сов. Композитор, 1984. – Вып.2. – 181 с.
12. Можейко, З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья. Село Тонеж. – Мн.: Наука и техника, 1971. – 263 с.
13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Вар¬фаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

## РЭКАМЕНДАВАНЫЯ СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Пастаноўка голасу» выкарыстоўваюцца наступныя формы дыягностыкі:

1. Калёквіўм;
2. Творчае заданне (у якасці якога прапануюцца наступныя віды работ: падрыхтоўка і напісанне сцэнарнага плана, выканальніцкі аналіз вакальнай партытуры);
3. Творчая работа (конкурс на лепшую інтэрпрэтацыю твора, паказ творчага нумара ў рамках тэматычнага канцэрта, на канферэнцыях);
4. Тэхнічныя залікі, залікі, экзамен, у працэсе якіх вывучаны матэрыял прадстаўляецца ў выглядзе паказа ў класе, канцэртнага выканання).

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Заняткі па вучэбнай дысцыпліне «Пастаноўка голасу» павінны прывіваць павагу і любоў да народна-песенных традыцый, самастойнасці выканання, развіваць навыкі выканальніцкага майстэрства.

Важнай часткай вучэбнай дысцыпліны «Пастаноўка голасу» з'ўляецца канцэртна-выканальніцкая дзейнасць, якая дысцыплінуе і стымулюе навучальны працэс. Неабходнай умовай дасягнення прафесійных вынікаў з'яўляецца ўважлівая і актыўная работа студэнтаў і патрабавальнасць выкладчыка да дакладнага выканання яго рэкамендацый на занятках. Яны маюць дакладную зместавую накіраванасць як для студэнтаў, так і для выкладчыка. Якасць гучання і выканальніцкая культура ўдасканальваюцца ў выніку сістэматычных рэпетыцый і канцэртнай дзейнасці. Рэкамендуецца праслухоўванне фоназапісаў народных выканаўцаў, запрашэнне выканаўцаў – носьбітаў традыцыйнага выканальніцтва на рэпетыцыі, якія дапамогуць у засваенні аўтэнтычнай манеры спеваў.

Для найбольш эфектыўнага засваення матэрыялу па дысцыпліне «Пастаноўка голасу» ужываюцца вучэбна-даследчыя тэхналогіі, якія прадугледжваюць вывучэнне дыялектных асаблівасцяў рэгіёнаў Беларусі, прыёмы вымаўлення паэтычнага тэксту і авалоданне народнай манерай спеваў (мясцовыя пеўчыя традыцыі, перайманне «з голасу», сувязь спеваў з асаблівасцямі дыялектаў).